# СВЯТОЧНЫ САЛЮТ

**Адам Захаравіч Петушкоў нарадзіўся ў 1918 годзе ў вёсцы Фядотава Буда Клімавіцкага раёна ў сям'і селяніна-бедняка.**

**У 1935 годзе скончыў Галіцкую сямігадовую школу і паступіў на педагагічныя курсы ў горадзе Клімавічы.**

**Працаваў настаўнікам пачатковых школ у вёсках Бірулі і Галузы Краснапольскага раёна.**

**У 1940 годзе быў прызван у Савецкую Армію.**

**У саставе 1-га Украінскага фронту прымаў удзел у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Дняпры, на Люцежскім плацдарме.**

**За подзвігі, праяўленыя пры вызваленні сталіцы савецкай Украіны – горада Кіева, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 студзеня 1944 года старшаму лейтэнанту Петушкову Адаму Захаравічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**

**Скончыў дзве ваенныя акадэміі.**

**Зараз палкоўнік Петушкоў выкладае ў адным з вышэйшых ваенных вучылішчаў Савецкіх Узброеных Сіл.**

...Вучылішча скончана. Дыплом з адзнакай. Радасць ад усведамлення таго, што пастаўленая мэта нарэшце дасягнута – ён танкіст і можа неадкладна адправіцца на фронт. І раптам, быццам цэбар халоднай вады, кароткі тэкст загаду "...Пакінуць у распараджэнні вучылішча".

Не, з гэтым Адам Петушкоў змірыцца не мог. Ідзе суровая франтавая восень 1942 года. Кожная зводка Саўінфармбюро – быццам трывожны набат, а ён – малады, здаровы, добра абучаны афіцэр, павінен адседжвацца ў тыле!

Рапарт начальніку вучылішча.

Рапарт у Міністэрства абароны.

Просьба адна: "Прашу адправіць на фронт". А замест адказу кароткая, але памятная гутарка з парторгам вучылішча.

– ...Думаеш ты тут адзін такі герой, а мы ўсе тылавыя ваякі?.. Не, брат. Кожны ў бой ірвецца. А загадана тут службу несці і нясём. Краіне зараз трэба рыхтаваць многа, вельмі многа танкістаў... Зразумеў?

Ён зразумеў. Некалькі месяцаў вучыў курсантаў і... прасіўся на фронт. Дзень, калі атрымаў назначэнне камандзірам узвода танкаў-тральшчыкаў 166 асобнага інжынерна-танкавага палка, быў для яго памятным.

Полк дзейнічаў у саставе 3-й гвардзейскай танкавай арміі на 1-м Украінскім фронце. Лістападаўскія дні 1943 года былі гарачымі. Ішлі баі за вызваленне сталіцы Украіны – Кіева, і "ўжывацца" ў франтавое становішча даводзілася, што называецца, з ходу. 4 лістапада ў другой палавіне дня танкавыя часці былі ўведзены ў бой. Танк-тральшчык

Петушкова адным з першых выехаў на міннае поле паміж вёскамі Малуцы і Гаранка, пратраліў яго, узарваў сем мін і адкрыў праход для гвардзейцаў. Стальная лавіна рынулася ўперад.

Наступіла цемра, але бой не сціхаў. Падаўляючы агнявыя кропкі, манеўруючы на мясцовасці, танк-тральшчык старшага лейтэнанта Петушкова, два танкі палка і некалькі танкаў 56 гвардзейскай брыгады прарваліся скрозь абарону фашыстаў і паімчаліся да Святошына – прыгарада Кіева.

Машына камандзіра ўзвода першай вырвалася на шасэ і з ходу ўрэзалася ў калону варожых аўтамашын. Скрыгатанне раздушанага гусеніцамі металу, бязладная страляніна, лямант ашалелых ад страху гітлераўцаў. Кідаючы ўцалелыя машыны, яны беглі прэч ад гэтага чырвоназорнага танка, які быццам прывід паявіўся з начной цемры і змятаў цяпер усё на сваім шляху.

Пакуль падаспелі астатнія экіпажы, шасэ было трывала загрувашчана грудамі разбітых аўтамашын. Цяпер подступы да гэтых барыкад прыкрывалі танкавыя гарматы. Шлях па шасэ для фашыстаў быў адрэзан.

На наступны дзень перад танкістамі паставілі новую баявую задачу – абысці Кіеў з захаду, выйсці на чыгунку і шасейную дарогу, што вядуць на Васількова – Фастава. Мэта – перакрыць шляхі адступлення ворага.

І зноў глыбокі рэйд у цемры. І зноў тральшчык Петушкова ўперадзе пракладвае шлях для сваіх таварышаў.

На світанні 6 лістапада выйшлі да Главахі. Заўважылі – на паўночнай ўскраіне пасёлка фашысцкі ар'ергард, узмоцнены трыма самаходнымі гарматамі, паспешліва займае абарону.

– Не з таго боку гасцей чакаюць, – пажартаваў старшы лейтэнант і прапанаваў: – а давайце ў гонар заўтрашняга свята "фрыцам" лазню наладзім...

Праз некалькі мінут танкі ўступілі ў бой. Дзве самаходкі запалалі адразу. Трэцяя схавалася ў лесе. Гітлераўская пяхота пабегла. Многія салдаты здаліся ў палон. Главаха была вызвалена. Нашы часці атрымалі магчымасць "сесці на плечы" адступаючаму ворагу.

26-ю гадавіну Кастрычніка і вызваленне сталіцы Украіны Адам Захаравіч разам з таварышамі сустракаў у Васількаве. А праз некалькі дзён зноў пачаліся цяжкія танкавыя баі. На вайне так заўсёды – мала свят, але многа цяжкай ратнай працы. І героем становіцца той, хто не ведае страху і стомы.

**Святочны салют // Магілёўская праўда. — 1970. — 27 лютага. — С. 4.**